філасофію, асаблівасці менталітэту і каштоўнасныя арыенціры. Бо толькі тады, калі мы ўсвядомім усю значнасць і неабходнасць той багатай культурнай традыцыі, якую нам падаравалі нашыя продкі, мы здолеем аб’яднаць грамадства на прынцыпах дабра, справядлівасці, чалавекалюбства і забяспечыць далейшы культурны прагрэс.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Дзядова, А. С.* Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі : манаграфія / А. С. Дзядова ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ун-т імя П. М. Машэрава, каф. беларус. мовазнаўства. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2013. – 161 с.

2. *Дубянецкі, Э. С.* Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. С. Дубянецкі ; маст. А. А. Глекаў. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с.

3. *Костина, А. В.* Национальная культура. Этническая культура. Массовая культура. «Баланс интересов» в современном обществе / А. В. Костина. – М. : ЛИБРОКОМ, 2009. – 214 с.

4. *Николаев, Р. М.* Роль традиционных ценностей в процессе становления новой культурной идентичности советского народа в довоенный и военный период / Р. М. Николаев // Искусствоведение и культурология. – 2011. – С. 196–208.

5. Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2021. – 481 с.

6. *Federowski, M.* Lud Białoruski na Rusi Litewskiej: materjały do etnografji słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905 / M. Federowski. – Warszawa : T-wo naukowe Warszawskie, 1935. – 490 s.


УДК 008(476):161.201.6

**А. І. Смолік,**
*доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# АТРЫБУЦЫЯ І СІСТЭМНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ АРТЭФАКТАЎ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСІ

**Анатацыя.** *У артыкуле аналізуецца вопыт сацыяльных інстытутаў па атрыбуцыі і сістэмным даследаванні аб’ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага народа. Адзначаецца актуальнасць іх дзейнасці, якая дэтэрмінавана крызісам культурнай ідэнтычнасці,*

*асабліва ў маладога пакалення. Падкрэсліваецца, што багатая культурная спадчына беларусаў можа быць эфектыўным механізмам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці моладзі.*

*Акцэнтуецца ўвага на адметнасці падыходу навуковай супольнасці Рэспублікі Беларусь да вызначэння сутнасці і зместу паняцця «нематэрыяльная культурная спадчына», зафіксаванага ў беларускіх нарматыўна-прававых актах. У адрозненне ад фармулёўкі ЮНЕСКА дадзенае паняцце ў Законе Рэспублікі Беларусь зафіксавана як «гісторыка-культурная каштоўнасць і яе нематэрыяльнае праяўленне».*

*Значная ўвага ў артыкуле надаецца разгляду дзейнасці навуковых і адукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь па фіксацыі і сістэмным даследаванні артэфактаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Паказана ў гэтым кірунку праца акадэмічных устаноў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у прыватнасці Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры.*

*Прасочваюцца асобныя формы дзейнасці калектываў устаноў вышэйшай адукацыі і сярэдніх агульнаадукацыйных школ па вывучэнні і засваенні каштоўнасцей нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

**Ключавыя словы:** *аб'ект, артэфакт, атрыбуцыя, даследаванне, нематэрыяльная культурная спадчына, ідэнтычнасць, сацыяльныя інстытуты, фіксацыя.*

**A. Smolik**
*Doctor of Cultural Studies, Professor, Head of the Department of Cultural Studies Belarusian State University of Culture and Arts,*
*Minsk, Republic of Belarus*

## ATTRIBUTION AND SYSTEMATIC RESEARCH OF ARTIFACTS OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE IN BELARUS

**Abstract.** *The article analyzes the experience of social instincts on attribution and systematic research of objects of intangible cultural heritage of the Belarusian people. The relevance of their activities is noted, which is determined by the crisis of cultural identity, especially among the younger generation. It is emphasized that the rich cultural heritage of Belarusians can be an effective mechanism for forming the national self-awareness of young people.*

*Attention is focused on the distinctiveness of the approach of the scientific community of the Republic of Belarus to the definition of the essence and content of the concept of "intangible cultural heritage" recorded in the Belarusian regulatory and legal acts. In contrast to the interpretation of the concept of «intangible cultural heritage» by UNESCO, the law of the Republic of Belarus defines «historical and cultural value and its intangible manifestation".*

*Considerable attention is paid in the article to the consideration of the activities of scientific and educational institutions of the Republic of Belarus on the fixation and systematic study of artifacts of intangible cultural heritage. The work of academic institutions of the National Academy of Sciences of Belarus, in particular the Center for the Study of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus is shown in this direction.*

*The article shows the separate forms of activity of collectives of higher educational institutions and secondary schools for the study and assimilation of the values of intangible cultural heritage.*

**Key words:** *object, artifact, attribution, research, intangible cultural heritage, identity, social institutions, fixation.*

Бягучае стагоддзе адзначана крызісам нацыянальнай ідэнтычнасці, шмат у чым абумоўленым стратай цэласнасці, этнічнай гісторыі як формы культурнай памяці. У сувязі з гэтым з набыццём незалежнасці Рэспублікай Беларусь перад дзяржавай і грамадскасцю паўстала стратэгічная задача рэканструкцыі сваёй самабытнасці, фарміравання і падтрымкі нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Беларускі народ за многія стагоддзі сваёй гісторыі стварыў багатую матэрыяльную і нематэрыяльную культурную спадчыну, якая прадстаўлена артэфактамі археалогіі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, міфалогіяй, фальклорам, абрадамі, рытуаламі, сакавітай мовай, традыцыйнымі тэхналогіямі і г. д. Дадзеная духоўная скарбніца з’яўляецца важнейшым інструментам канструктыўнага разумення асобай сваёй належнасці да этнасу, яго гісторыі і культуры. У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей» адзначаецца, што дзяржава прызнае культурныя каштоўнасці важным фактарам развіцця краіны і фарміравання ў грамадзян нацыянальнай ідэнтычнасці [1, с. 3–4].

Актуалізацыя захавання і ўключэння ў сацыяльна-культурную практыку артэфактаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – НКС) у Беларусі адбылася пасля прыняцця ЮНЕСКА ў 2003 г. Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны [10], якая была ратыфікавана ў Рэспубліцы Беларусь у снежні 2004 г. За два дзесяцігоддзі ў Беларусі назапашаны багаты вопыт у галіне атрыбуцыі і сістэмнага даследавання НКС. Аналіз дзейнасці сацыяльных інстытутаў па ідэнтыфікацыі артэфактаў культуры і аднясенні іх да НКС сведчыць, што існуе шмат розных падыходаў да працэсу іх патрыманіялізацыі. Адным з іх з’яўляецца вызначэнне артэфактаў, якія намінуюцца ў якасці аб’ектаў НКС. Навуковая супольнасць Беларусі ў гэтых адносінах абапіраецца на вызначэнне дадзенай дэфініцыі, якая ўтрымліваецца ў Канвенцыі ЮНЕСКА і Законе Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей». У Законе адзначаецца, што да артэфактаў НКС належаць звычаі, традыцыі, абрады, фальклор, мова, яе дыялекты,

змест геральдычных, тапанімічных аб’ектаў, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і іншыя нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека. Артэфакты НКС падраздзяляюцца на дзве катэгорыі: «А» – каштоўнасці, якія поўнасцю аўтэнтычныя і верагоднасць якіх нязменная; «Б» – каштоўнасці, поўнасцю ці часткова зафіксаваныя альбо часткова ўзноўленыя на другасным матэрыяле, а таксама значныя духоўныя, мастацкія і дакументальныя якасці, што з цягам часу могуць змяняцца [1, с. 14].

Дыскусійным пытаннем для шэрагу суб’ектаў, якія даследуюць артэфакты НКС, з’яўляецца «Хто і якім чынам устанаўлівае гісторыка-культурную каштоўнасць аб’екта НКС?». У Беларусі нематэрыяльныя праявы творчасці суб’ектаў культуры, якія прадстаўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць, выяўляюцца шляхам прафесійнай дзейнасці, у тым ліку і носьбітамі гэтых каштоўнасцей. НКС падлягае фіксацыі, навуковай апрацоўцы і мастацкай ацэнцы ў парадку, устаноўленым Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. На міністэрства дзяржавай ускладзена асноўная функцыя па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы НКС. У гэтых мэтах пры ім створана Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны [2]. Яна прымае рашэнне аб неабходнасці надання артэфакту культуры статусу нематэрыяльнай праявы творчасці чалавека і аднясення яго да аб’екта НКС пэўнай катэгорыі. Рада таксама прымае рашэнне аб немагчымасці навукова абгрунтаванага аб’яўлення артэфактам гісторыка-культурнай спадчыны каштоўнасці ў выпадку страты ёй выключных духоўных, мастацкіх або дакументальных вартасцей. Так, па яе рашэнні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей унесена значная колькасць артэфактаў НКС [7, с. 41].

Вядучая роля ў даследаванні семантыкі, фенаменалогіі і семіётыкі артэфактаў НКС беларусаў належыць Цэнтру даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. У выніку рэалізацыі дзяржаўных праграм «Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: праблемы захавання», «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ажыццёўлена комплекснае натурнае даследаванне мноства аб’ектаў НКС і выданне шматтомных калектыўных навуковых прац, такіх як чатырохтомнае сачыненне «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» (Т. 3. «Культура сяла XIV – пачатку XX ст.»). У іх утрымліваецца апісанне беларускіх каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых цыклаў, звычаяў і абрадаў, звязаных з хатнімі жывёламі. У асобных раздзелах разглядаюцца ландшафтныя культавыя помнікі дахрысціянскага перыяду, міфы, народныя ўяўленні пра ведзьмакоў і ведзьмаў, знахарства і рытуальна-магічнае лячэнне [12].

У кантэксце рэалізацыі дзяржпраграмы на 2016–2020 гг. інстытутам праведзена даследаванне па праблеме «Сучасныя этнічныя традыцыі

Рэспублікі Беларусь». Вынікам навуковых пошукаў вялікага калектыву (16 чал.) з'явілася праца «Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем». У ёй на аснове палявых этнаграфічных даследаванняў і архіўных крыніц рэканструяваны многія этнакультурныя традыцыі, ранняя этнічная і канфесійная гісторыя Беларусі. У шэрагу раздзелаў разглядаюцца адметныя асаблівасці культуры насельніцтва цэнтральнага рэгёна Беларусі – матэрыяльнай (адзенне, жыллё, традыцыі харчавання), сацыяльнай (адносіны ў сям'і, этнічных групах, нацыянальна-культурных супольнасцях) і духоўнай (каляндарныя абрады і святы) [14].

Навуковы калектыў інстытута працягвае працаваць над серыяй рэгіянальных выданняў, якія адлюстроўваюць духоўнае багацце і разнастайнасць лакальных праяў НКС беларусаў у яе аўтэнтычных формах. Асаблівасцю прац гэтай серыі з'яўляецца тое, што традыцыйная культура разглядаецца не толькі праз ўспрыманне даследчыкаў, а ў першую чаргу вачыма яе носьбітаў. Ва ўжо надрукаваных працах серыі «Традыцыйная адзенне», «Традыцыйны народны тэкстыль», «Танцавальны фальклор» і іншых простая мова носьбітаў традыцый спалучаецца з навуковым тэкстам.

Важным напрамкам працы інстытута з'яўляецца ўдасканаленне метадалогіі па атрыбуцыі артэфактаў НКС. З гэтай мэтай праведзена некалькі міжнародных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый: «Культурная спадчына як духоўная каштоўнасць у выхаванні і развіцці дзяцей і моладзі», «Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка», арганізавана пяць міжнародных канферэнцый: «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва», «Сусветная фальклорная спадчына: мінулае, сучаснасць, перспектыўныя напрамкі даследавання». У апошняй прымалі ўдзел навукоўцы Аўстраліі, Еўропы, Канады і ЗША [9]. У выніку напружанай навукова-даследчай дзейнасці аўтарскіх калектываў, якія складаюцца з навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і шэрагу ўстаноў вышэйшай адукацыі, а таксама Польшчы, сістэматызаваны шматлікія фрагменты міфаў, створаных беларускім этнасам. Вынікам навуковых пошукаў сталі фундаментальныя працы: «Беларуская міфалогія» [5] і «Міфалогія беларусаў» [11], «Беларускі фальклор» [6] і інш.

Значны патэнцыял у галіне атрыбуцыі і актывізацыі работы па захаванні і ўключэнні ў сацыяльна-культурную практыку артэфактаў НКС маецца ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі. Цікавы вопыт у гэтым кірунку назапашаны Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Тут на працягу апошніх гадоў праводзіліся міжнародныя канферэнцыі па праблемах вывучэння, захавання, пераймання маладым пакаленнем аўтэнтычнага фальклору. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў канферэнцый знаходзіўся фальклор у яго аўтэнтычным выглядзе, што працягвае жыць у памяці старэйшага пакалення сельскіх жыхароў.

У сувязі з гэтым на канферэнцыі запрашаліся носьбіты фальклорных традыцый, якія выконвалі ў неапрацаваным выглядзе народныя песні і танцы, дэманстравалі традыцыйныя спосабы вырабу ўтылітарных прадметаў побыту [3]. Важную ролю ў галіне захавання і рэвіталізацыі артэфактаў НКС адыгрывае Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУКМ, дзе вядзецца грунтоўнае даследаванне артэфактаў як жывой спадчыны. Традыцыйнай стала міжнародная навуковая канферэнцыя «Этналогія: традыцыі і сучаснасць», якая праводзіцца Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам [13].

Развіццё інфармацыйных тэхналогій прывяло да таго, што ў цяперашні час у сферы вывучэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўсё больш актыўна выкарыстоўваюцца новыя спосабы апрацоўкі і прадастаўлення інфармацыі. Электронныя базы даных, прэзентацыі, інтэрнэт-рэсурсы і іх прымяненне ў Рэспубліцы Беларусь паказваюць, што гэтыя тэхналогіі ў асноўным выкарыстоўваюцца ў акадэмічных інстытутах і УВА. Так, рэстаўрацыяй фальклорных твораў і пераносам іх на сучасныя лічбавыя носьбіты інфармацыі займаюцца супрацоўнікі аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Тут створана электронная база даных «Замоўна-заклінальная паэзія беларусаў», распрацаваны інтэрфейс карыстальнікаў для ўвядзення, прагляду і абнаўлення матэрыялаў, а таксама электронны паказальнік персанажаў замовы. Дадзеная тэхналогія значна спрашчае магчымасць рэпрэзентацыі лепшых узораў нацыянальнай традыцыі ў сетцы Інтэрнэт, спрыяе захаванню існуючых тэкстаў на даўгавечных носьбітах інфармацыі, сістэматызацыі фальклорных матэрыялаў канкрэтнага жанру ў адпаведнасці з магчымасцямі камп’ютарнага выкарыстання [8, с. 57]. З дапамогай інфармацыйных тэхналогій ствараецца ўся фальклорная калекцыя інстытута. У ёй захоўваюцца крыніцы, якія сталі асновай 4-томнай анталогіі іх фальклорных тэкстаў «Беларуская народная творчасць».

Пытаннямі захавання фальклорнага матэрыялу на аснове інфармацыйных тэхналогій актыўна займаюцца студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З мэтай захавання і рэвіталізацыі беларускага фальклору тут створана вучэбна-навуковая лабараторыя, дзе распрацоўваецца комплексная праграма апрацоўкі архіваў на аснове сучасных сродкаў збірання і распаўсюджвання інфармацыі. Гэта абумоўлена тым, што фальклор праз сваю разнастайнасць патрабуе сінергетычных, інтэграваных сродкаў прэзентацыі ў сучаснай інфармацыйнай прасторы. Фалькларыстыка цяпер мае магчымасць пашырыць арсенал традыцыйных метадаў вывучэння і рэвіталізацыі артэфактаў НКС за кошт выкарыстання найноўшых мультымедыйных тэхналогій. З іх дапамогай магчыма палепшыць метады і формы адлюстравання і ўключэння артэфактаў НКС у сетку Інтэрнэт. Так, флэш-тэхналогія можа быць асновай

стварэння інтэрактыўнай мультымедыйнай энцыклапедыі «Фальклор Беларусі», мультыплікацыйнай анімацыі, мультымедыйнага роліка і г. д.

Дадзеная тэхналогія эфектыўна выкарыстоўваецца студэнтамі БДУ, дзе ў лабараторыі распрацавана методыка пераносу недаўгавечных стужачных фона- і відэазапісаў фальклору (бабін і стацыянарных аўдыякасет) у электронны варыянт гучання/прагляду. Выкарыстоўваючы дадзеную методыку, у лабараторыі ўжо ідэнтыфікавалі каля 37 тыс. фальклорных адзінак, апрацавалі 236 сюжэтаў відэаматэрыялу. Такі падыход дасць магчымасць стварыць сістэму інфармацыйнага забеспячэння фондаў НКС у выглядзе эталонных баз даных па відах і жанрах беларускага фальклору, аблічбаваць пакуль яшчэ існуючыя фона- і відэазапісы для іх выратавання ад фізічнага знішчэння [4, с. 59–60].

Даследаванне дзейнасці УВА Беларусі паказвае, што іх студэнты і выкладчыкі ўдзельнічаюць у стварэнні фальклорных і этнаграфічных мультымедыйных рэсурсаў. Напрыклад, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў ажыццявілі аблічбоўку абраду Купалле, стварэнне электроннай фальклорна-этнаграфічнай энцыклапедыі «Жыццёвае кола чалавека: ад нараджэння да надмагільнага крыжа», флэш-роліка «Калядныя абрады і песні», флэш-сайта «Віртуальны музей славянскіх абрадавых лялек» і інш. [9, с. 170–172].

Размяшчэнне ў Інтэрнэце аблічбаваных малюнкаў артэфактаў НКС дазволіць навукоўцам выйсці на прынцыпова іншы ўзровень пошукаў. Сукупнасць малюнкаў і апісанняў аб’ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны дасць магчымасць праводзіць даследчыкам кампаратыўны і герменеўтычны аналіз гісторыка-культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Абагульняючы дзейнасць акадэмічных і адукацыйных інстытуцый Беларусі ў галіне стварэння інфармацыйных рэсурсаў НКС, варта адзначыць, што магчымасці інфармацыйных тэхналогій для захавання і рэвіталізацыі артэфактаў традыцыйнай культуры выкарыстоўваюцца яшчэ не ў поўнай меры. Глабальныя інфармацыйныя сеткі пераважна прымяняюцца для перадачы канкрэтных паведамленняў аб культурных падзеях і з’явах, але гэта мала спрыяе папулярызацыі артэфактаў НКС. На наш погляд, неабходна пабудаваць комплекс інфармацыі, які адкрывае перад карыстальнікамі сістэму ведаў у даступнай і нават забаўляльнай форме.

Зыходзячы з разумення народнай творчасці як найважнейшага сродку фарміравання духоўнага здароўя маладога пакалення, таксама будуюць сістэму адукацыі і выхавання ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах Беларусі. У краіне працуюць дзясяткі ўстаноў па рэкамендацыях, распрацаваных у пачатку 2000-х гг. навукова-педагагічным калектывам сацыяльна-педагагічнага праекта «Этнашкола». Калектыў прапанаваў беларускім педагогам навукова абгрунтаваную мадэль сучаснай школы, у якой разам з абавязковымі навучальнымі прадметамі павінны засвой-

ваццa элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў. Пры гэтым знаёмства з імі павінна адбываецца ў розных формах, пачынаючы з падрыхтоўчых і да выпускных класаў.

Такім чынам, артэфакты нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў з'яўляюцца аб'ектам фіксацыі, вывучэння і засваення навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі розных тыпаў. Значны ўнёсак у гэту справу робяць таксама такія сацыякультурныя ўстановы, як бібліятэкі, дамы рамёстваў і фальклору, музеі і інш.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

*1.* Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь [Электронный ресурс] : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З // Консультант Плюс : Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011.

*2.* Аб Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 16 окт. 1998 г., № 1590 // Консультант Плюс : Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011.

*3.* Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зб. навук. прац удзельнікаў III Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29–30 крас. 2009 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 34–35.

*4. Бей, А. С.* Праблемы захавання абрадава-святочнай культуры Палесся / А. С. Бей // З. Даленга-Хадкоўскі і праблемы комплекснага даследавання фальклору Палесся (да 220-годдзя Зарыяна Даленгі-Хадкоўскага): уклад. В. Д. Ліцвінка. – Мінск, 2006. – С. 59–62.

*5.* Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*6.* Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; сярод навук. кансульт.: А. М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2005–2006.

*7. Ван, Дань.* Нематериальное культурное наследие Беларуси: теория и практика сохранения и ревитализации / Ван Дань, А. И. Смолик ; науч. ред. Л. К. Кухто. – Минск : РИВШ, 2022. – 207 с.

*8. Ганчарова, С. Л.* Мультымедыйныя сродкі адлюстравання фальклорнага матэрыялу / С. Ганчарова, Л. Сярогіна // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зб. навук. прац удзельнікаў V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 крас. – 1 мая 2011 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 170–172.

*9. Лакотка, А.* Развіццё нацыянальнай культуры – адна з прыярытэтных задач гуманітарнай навукі / Аляксандр Лакотка // Культура

Беларусі: рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 12–13 чэрв. 2012 г. / уклад.: А. А. Галкін, І. Р. Голубева. – Мінск, 2012. – С. 48–53.

*10.* Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия [Электронный ресурс]: принята 17 окт. 2003 г. 32-й сессией Генеральной конференции ООН по вопросам образования, науки и культуры (ЮНЕСКО). – Код доступа: http://unesdoc.unesco.org/images/0013/001325/132540r.pdf. – Дата доступа: 18.10.2022.

*11.* Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўнік / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд.: Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 605 с.

*12.* Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. – Т. 3: Культура XIV–пачатку XX ст. – Кн. 2: Духоўная культура / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 751 с. : іл.

*13. Смолік, А. І.* Нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі: тэарэтыка-метадалагічнае поле і практыка / А. І. Смолік // Тэарэтычныя і прыкладныя аспекты этналагічных даследаванняў : зб. навук. арт. / пад навук. рэд. Н. П. Мартысюк. – Мінск, 2019. – С. 24–30.

*14.* Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем / А. Вл. Гурко [и др.]; науч. ред. А. Викт. Гурко; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит. ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск : Беларус. навука, 2016. – 540 с. : ил.

УДК [785+78.03](476)

**В. В. Сукало,**
*магистр, творческий работник, г. Бобруйск, Республика Беларусь*

# КУЛЬТУРА ИНСТРУМЕНТАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬСТВА В БЕЛАРУСИ: РЕТРОСПЕКТИВА И СОВРЕМЕННОСТЬ

**Аннотация**. *Создание учебных программ и музыкальных кафедр, направленных на изучение старинной музыки, продиктовано необходимостью сохранения и развития культуры инструментального исполнительства различных музыкальных периодов. Интерес к белорусской музыкальной культуре и традиции исполнительских школ белорусского барокко, Великого Княжества Литовского, а также к музыке старосветских усадеб белорусской шляхты, частновладельческих, войсковых и церковных капелл и т. д. проявляется у ряда отечественных и зарубежных исследователей многих стран, современных сольных исполнителей и ансамблей.*

**Ключевые слова**: *старинная музыка, инструментоведение, лютня, музыкальная археология, музыкальное исполнительство.*